впечатления. В своем творчестве он выражает свои мысли и чувства наиболее подходящими с его точки зрения изобразительными средствами, поэтизируя природную стихию.

Характерным примером является картина «Зимний вечер» (2008). Она наполнена особой поэтичностью. При непосредственном восприятии этого художественного произведения, даже представляешь, как пахнет снегом и слышится его скрип. На полотне в доме из окошечка горит свет, давая знать о том, что там тебя всегда ждут и будут рады встрече с тобой, напоминая о встрече с яркими воспоминаниями из детства.

Полны тепла к родной земле и лирических чувств произведения П. Лукьяненко «Лето. Сож» (2000), «Пейзаж» (2000), «Осенняя роща» (2001).

В картине «Пейзаж» (2000) характерным является сочетание ярких пятен почти чистого желтого и красного цвета, которые прорываются через синие оттенки уже позднего вечера. Пейзаж полон силы контраста ярких цветов догорающего вечернего солнца. Эмоциональный подъем, лиризм раскрытый в лаконичных формах, усиленный цветным решением, являются доминантными в произведениях художника.

В традиционной реалистической манере выполнены многие произведения С.В. Ковальчука. Горячая любовь к природе родного края – основная тема его картин. В них художник стремится, как можно более объективно, точно и полно передать бесконечное разнообразие растительного мира. Он создает прекрасные, одухотворенные образы природы, стараясь всеми возможными способами передать неповторимую красоту ее лесов и полей.

На его картинах мы можем увидеть бесконечные дали с ее лесами, полями и озерами, утреннее состояние леса (например «Утро на лугу» (2010), «Утро в лесу» (2010)). Мы видим бесконечный и пронизывающий свет в его картинах, очень прекрасно художник передает настроения времени года в прекрасных зарисовках нашей природы. На картинах художника бескрайние просторы, водные глади, солнечные лучи, сгущающиеся облака, неуловимое ощущение приближающегося дождя, свежесть осеннего воздуха. Поля, леса, реки, небольшие деревеньки – любимые образы С. Ковальчука представлены в таких произведениях как: «Осенние краски» (2011), «Деревня» (2009), «Болотце» (2011), «Старый луг» (2010).

**Заключение.** Таким образом, образ природы поэтизируется и это заметно в стремлении большого количества современных мастеров к объединению живописи и духовной основы мировоззрения, что позволяет глубоко воздействовать на зрителя, вызывать чувство сопереживания, чувство сопричастности к произведению, при котором воспринимающий картину окунается в ее внутренний мир.

Список литературы

1. Белорусская пейзажная живопись: альбом / ред.-сост. Г.Ф. Шауро. – Минск: Беларусь, 1982. – 163 с.
2. История русского и советского искусства: учеб пособие для вузов / редкол.: Д.В. Сарабьянов (гл. ред.) [и др.]. – 2-е изд., перераб. и доп. – М.: Высшая школа, 1989. – 448 с.
3. Беларускае мастацтва дваццатага стагоддзя: альбом-каталог / склад. Г.Б. Багданава [і інш.]. – Мінск: Чатыры чвэрці, 2001. – 265 с.

## ГІПЕРРЭАЛІЗМ У СУЧАСНЫМ ЖЫВАПІСЕ: НЕВЕРАГОДНА ДАСКАНАЛАЯ І ФАНТАСТЫЧНА ПРАЎДЗІВАЯ РЭАЛЬНАСЦЬ

*М.Л. Цыбульскі*
*Віцебск, ВДУ імя П.М Машэрава*

У выяўленчым мастацтве некалькіх апошніх гадоў гіперрэалізм зусім не актуальная навацыя. І тым не менш, нельга не прызнаць, што цікавасць да яго паэтыкі і стылістыкі з боку жывапісцаў, графікаў і нават скульптараў сёння асаблівая. Пра гэта сведчаць творы мастацтва, прадстаўленыя на шматлікіх выставах розных узроўняў: ад міжнародных біенале і трыенале сучаснага мастацтва, да нацыянальных і рэгіянальных праектаў, персанальных выстаў. Можна без перабольшвання сцвярджаць, што за апошнія гады гіперрэалізм стаў сапраўдным трэндам у мастацтве.

Мэта дадзенага артыкула – прааналізаваць паэтыка-стылістычныя асаблівасці гіперэалізма ў сучасным мастацтве, вызначыць і даследаваць творчасць найбольш адметных прадстаўнікоў гэтага накірунку ў сусветным жывапісе.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне праводзілася на матэрыяле сучаснага сусветнага жывапісу, прадстаўленага на буйнейшых выставах Еўропы, Азіі і Амерыкі. Асноўныя метады – храналагічны і параўнальна-апісальны.

Репозиторий ВГУ

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У мастацкім асяроддзі сёння не вельмі пазітыўна адносяцца да гіперрэалізму, часта не прымаюць яго за адсутнасць у ім выразна пазначаных прыкмет "сапраўднага", "паўнавартаснага" мастацтва і, у першую чаргу, наватарства і творчага палёту фантазіі. Нехта проста не бачыць у гіперрэалізме ніякага сэнсу, сцвярджаючы, што гэта не мастацтва, а рамяство для якога не патрэбны талент а патрабна ўсяго толькі ўседлівасць. Фотарэалізм (гіперрэалізм) здаецца заўжды быў накірункам ў мастацтве, які спараджаў спрэчкі, як з боку традыцыйных рэалістаў, так і з боку прадстаўнікоў так званага авангарду. Немагчыма не пагадзіцца з тым, што якім бы бязмежным не здавалася поле творчых эксперыментаў у мастацтве выяўленчым, але на ім заўжды знаходзілася месца рэалістычнаму мастацтву. Бо рэалізм аперыруе пазнаваемымі выявамі. У сувязі з гэтым "камунікатыўная функцыя твора мастацтва ажыццяўляецца ў рэалізме найбольш поўна, пасланне мастака гледачу звычайна не патрабуе дадатковых тлумачэнняў [1, с. 24]. Відавочна, што і гіперрэалізм гэта вялікае тэхнічнае майстэрства і яго роля ў гэтым сэнсе, неацанімая для з'яўлення новых тэндэнцый у развіцці разнастайных форм вобразнасці. Бо сення, як і раней ў мастацтве вельмі важна, як ты выказваеш сваю думку, якія мастацкія сродкі і ў якім кантэксце для гэтага выкарыстоўваеш.

Цікавасць да стылістыкі фотарэалізма праявілася ў другой палове 1960-х гадоў. У жывапісе гіперрэалізм быў заснаваны на блізкім да фатаграфічнага капіравання рэчаіснасці, стварэнні пераканаўчай ілюзіі рэальнасці. Фотавыява ўсведамлялася мастакамі як "другая прырода", якая станавілася асновай для стварэння жывапісных твораў. З мэтай намаляваць свет не проста падобным, а звышпадобным гіперрэалісты выкарыстоўвалі механічныя спосабы капіявання фатаграфій, павелічэнні іх да памераў вялікага палатна, пры дапамозе дыяпраекцыі. Мастакі адлюстроўвалі сцэны сучаснага жыцця, для чаго акрамя фатаграфічных, выкарыстоўвалі і кінематаграфічныя прыёмы: буйны план, здымак з высокай кропкі, раскадроўку і інш. Фотарэалісты імкнуліся адлюстраваць сутнасць сучаснага жыцця, абвастрыць наша ўспрыняцце рэчаіснасці, пры гэтым захоўваючы эмацянальна інэртную стылістыку фотаздымка. Пытанне індывідуальнага почырку, як и самавыражэння мастака, здавалася пераставала быць актуальным.

Напачатку 70-х гадоў мінулага стагоддзя слова "гіперрэалізм" было ўсяго толькі назвай вялікага каталога і выставы ў Брусэлі на якой былі прадстаўлены пераважна творы амерыканскіх жывапісцаў. І толькі у наш час тэрмін пачалі больш сур'ёзна задумвацца аб яго сутнасці. Безумоўна, мастацкі досвед гіперрэалізма быў запатрабаваны постмадэрнізмам, а шэраг прыёмаў стаў арганічнай часткай постмадэрніцкай мастацкай мовы.

Агульнавядома, што слова "гіперрэалізм" было прыдумана Isy Brachot у 1973 годзе як французскі сінонім слова "фотарэалізм". Доўгі час гэтыя тэрміны выкарыстоўваліся адначасова і паміж імі не бачылі ніякіх адрозненняў. Пры гэтым амерыканскія даследчыкі аддавалі перавагу тэрміну "фотарэалізм", у той час як французскі навукоўцы часцей карысталіся паняццем "гіперрэалізм", магчыма  пад уплывам праграмных тэкстаў Ж. Бодрийяра, які ўспрымаў гіпер- як наступную стадыю пасля сюррэалізму на шляху да панавання сімуляцый і сімулякраў у сучаснай культуры. Але ж новы ўсплеск гіперрэалізма у мастацтве 1990 – пачатку 2000-х гадоў, здаецца скарэкціраваў тэрміналагічную сутнасць гэтых паняццяў і развёў іх. Стала відавочнай, неабходнасць адрозніваць паняцце "фотарэалізм", якое часцей выкарыстовалася для пазначэння творчасці еўрапейскіх фотарэалістаў 1970-х гадоў і гіперрэалізм, як тэндэнцыю, плынь у мастацтве 1990 – пачатку 2000-х гадоў.

Зразумела, што ў гіперрэалізме, як і ў фотарэалізме галоўным прыёмам з'яўляецца візуальная сімуляцыя рэальнасці. Але ў фотарэалізме гэта часцей проста прыём, арыентацыя на выкарыстанне пэўных сродкаў, з'арыентаваных на пасіўную фотарэпрэзентацыю рэальнасці. У сваю чаргу ў гіперрэалізме – аналагічныя мастацкія сродкі выкарыстоўваюцца значна больш у эстэтычных мэтах і скіраваны на стварэнне адпаведнай вобразнасці. Гіперрэалізм у яго сучасным выглядзе не імкнецца літаральна капіяваць паўсядзённую рэальнасць. Больш таго гіперрэалістычныя творы сення зусім не маюць на мэце паўтарыць фотаздымак а некаторыя нават цалкам не пішуцца з іх. Мастакі нярэдка спецыяльна прыдумваюць нерэальныя сюжэты, ці колеры, каб гэтым неяк адрозніць свае творы ад больш прымітыўнага на іх погляд, фотарэалізма. Сёння мова гіперрэалізма ахоплівае пераважную большасць сфер паўсядзённага жыцця, як і не ведае тэматычных, сюжэтных і жанравых межаў.

Нягледзячы на тое, што стылістыка гіперрэалізма ў значнай ступені была прыдумана выключна з мэтай, паказаць узровень тэхнічнага майстэрства мастака, сення усё часцей кажуць пра наяўнасць у ім пэўнай канцэпцыі. Калі фотарэалізм 70-х сапраўды выступаў антытэзай канцэптуалізму, які адмовіўся ад рэпрэзентацыі рэчаіснасці, то гіперрэалізм 90-х пайшоў з

Рэпазіторый ВДУ

канцэптуалізмам на відавочную "змову". Пра гэта сведчаць большая ўскладнёнасць і нават нейкая загадкавасць вобразнага ладу ў творах прадстаўнікоў гіперрэалізму. Цікавасць да натуралістычна дакладнай перадачы натуры сёння з'арыентавана на багаты вопыт мас-медыа, злучана з выкарыстаннем прыёмаў кіна і фотамастацтва, камп'ютарных эфектаў. Больш выразным у параўнанні з фотарэалізмам 70-х у наш час у гіперрэалістычных творах паўстае эксперыментальны пачатак, які ў першую чаргу злучаны з засваеннем найболей перадавых тэхналогій. Стылістыка гіперрэалізму наблізіла станковыя формы мастацтва да дызайну, у якім віртуальная прастора стала арганічнай для яе развіцця [2].

Асаблівае месца сярод твораў жывапісу і графікі, якія выкананы ў стылістыцы гіперрэалізму займае **партрэт**. Сучасныя мастакі з розных краін свету дасягаюць небывалага падабенства з натурай. Немалая упартасць і талент, аўтараў робяць гэтыя творы чымсьці больш, чым простай копіяй фатаграфіі. У іх жыцце, бачанне мастаком свету, эмоцыі творцы (палотны і малюнкі амерыканскіх мастакоў Ігаля Озэры, Брайяна Друры, Джефа Рамірэза, Дафі Шэрыдан, Лі Прайс, расіяніна Генадзя Улыбіна, аўстрыйскага мастака Готфрыда Хэлнвэйна, мексіканскіх мастакоў Амара Орціса і Камалкі Лаўрыяны, іспанца Элой Маралес, карэйскай мастачкі Рым Лі, галандскай мастачкі Джанціны Пеперкамп, брытанскіх мастакоў Сымона Хенэсі, Гарэт Эдвардс, Стыва Калдвэл, Робіна Элей, турэцкага мастака Туна Ферыт). Выявы жанчын і мужчын, якія плаваюць у вадзе, ці адлюстраваны разам з вадой, праз ваду складаюць аснову творчасці венесуэльскага мастака Густаво Сільва Нуньеса і канадскай мастачкі Хізэр Хортан, мастака з Швецыі Лінэа Стрыда, нямецкай мастачкі Карын Кнэфель, англійскага мастака Олівера Уілсана. Даволі распаўсюджаны ў творчасці прыхільнікаў гіперрэалізму кампазіцыі з фігурамі, творы на пэўныя тэмы (кампазіцыі амерыканскіх мастакоў Тэры Роджэрса, Тэрэзы Эліат, Гая Джонсана, аўстралійца Джерэмі Гедеса, нямецкага мастака Майка Драгаса, англійскага мастака Мітча Грыфітса).

Папулярны кірунак у графіцы уяўляюць гіперрэалістычныя партрэты, якія намаляваны простым алоўкам, вугалем, пастэллю і нават шарыкавай ручкай (творы шатландца Пауля Кэдэна, мастака з Ганконга Пола Ланга, партугальца Сэмюэля Сільвэ, расіянак Вольгі Ларыёнавай і Наташы Кінару, кубінца Хорхе Лопез Пардо, амерыканца Мэтью Дуст, італьянца Марчэла Барэны, іспанца Элоў Маралес Раміра, немца Дзірка Дзімірскага, і амерыканскай мастачкі Наталлі Воджел і інш.)

Асаблівую групу твораў у гіперрэалізме складаюць нацюрморты, сярод якіх творы італьянскіх мастакоў Эмануэле Дасканіа, Дарыа Кампаніэле. Шырока вядомы майстры малявання асобных аб'ектаў, як нацюрмортаў – амерыканцы Патрык Крамэр і Майкл Зыгмонд, канадскія мастакі Карлі Вайто і Джэйсан дэ Граф, іспанец Педра Кампос, сінгапурскі мастак Іван Ху, італьянец Марчэла Баренжы. Папулярна ў мастакоў гіперрэалістаў і кулінарная тэма. Англійскі мастак Том Марцін малюе нацюрморты на якіх разнастайныя салаты, закускі, дэсерты. Вядомасць італьянскаму мастаку Луіджы Бенедычэнці прынеслі карціны з вельмі падрабязнымі малюнкамі пірожных, тартоў, кветак, а амерыканцу Дэнісу Вайткевічу – буйным планам намаляваная садавіна.

У гіперрэалістычным пейзажы часта гучаць праблемы празмернай урбанізацыі асяроддзя, разбурэння экалогіі. Пейзаж займае трывалае месца ў творчасці мастачкі англійскага паходжання Рафаэлы Спэнс. Яшчэ адна не менш запатрабаваная тэма – анімалістыка. Карціны і малюнкі з выявамі жывёл можна знайсці ў творчасці Коліна Богла, Пауля Лунге, Лісандра Пэна. Многія прадстаўнікі гіперэалізму вучыліся асновам класічнага жывапісу і графіцы ў розных акадэміях, але ў гэтым кірунку вельмі шмат і самавукаў. Сярод іх расійская мастачка Галіна Севасцьянава, брытанец Піліп Мюноз, мексіканец Хуан Карлас Маньяарэс, італьянец Франка Клун.

**Заключэнне**. Усе вышэй адзначанае дазваляе лічыць гіперрэалізм больш складанай формай, своеасаблівай эвалюцыяй фотарэалізму. Пры гэтым відвочна, што мяжа паміж гіперрэалізмам і фотарэалізмам настолькі тонкая, што часта ўсё выглядае як адзіны стыль. Як раней, так і зараз, пры маляванні партрэтаў ці тэматычных кампазіцый у якасці "натуры", ці дакладней крыніцы візуальнага матэрыялу, мастакі выкарыстоўваюць узоры паліграфічнай прадукцыі, пастановачныя фатаграфіі, слайды, лічбавыя фотаматэрыялы. Гэта дае магчымасць надаць больш увагі дэталям, якія на карціне глядач можа разглядаць.

Спіс літаратуры
1. Князева, Е. Игры с реальностью / Е. Князева // Искусство. – 2009. – № 16. – С. 24.
2. Гиперреализм. Когда реальность становится иллюзией. – М.: Издательство: Галарт, 2015. – 248 с.



Репозиторий ВГУ